Надзея ПАРЧУК, г. Брэст

## Каб шчасце нязгасна цвіло...

*Каб рэкі паілі нас чыстай вадой,*
*А ў полі калоссе шумела –*
*Не цешмася, людзі, чужою бядой,*
*Каб наша, крый Бог, не паспела.*

*Каб лад быў у хатах,*
*а ў душах святло,*
*І радасць усмешкай вітала –*
*Давайце маліцца за тое сяло,*
*Дзе нас калісь маці люляла.*

*Павінна хоць штосьці*
*застацца святым*
*У нашых зняверанаых сэрцах,*
*Бо толькі жывём мы,*
*пакуль даражым –*
*Радзімай, рачулкай, азерцам.*

*Каб шчасце людское нязгасна цвіло*
*На нашых жыццёвых сцяжынах,*
*Адорвайма іншых*
*сардэчным цяплом –*
*Найшчодра, нястомна, няспынна.*

## Залатая восень на парозе...

*Вось і лету палкаму канец –*
*Залатая восень на парозе.*
*Захавай касу сваю, касец,*
*Глянь, буслы ўжо родныя ў дарозе.*

*Больш хадзіць не будуць*
*за табой –*
*Аглядаць духмяныя пакосы;*
*Паляцелі дружнай талакой,*
*Сенажаці кінулі і росы...*

*Праляціць і восень, і зіма,*
*Сакавік засочыць між пратапін,*
*А затым вясняначка сама*
*Уваскрэсне – буслаў прывітае.*

## Думкі ўпотай

*Я радасцю кожнай сваёю*
*Заўжды падзялюся з табою,*
*А сум і гаркоту схаваю –*
*Лепш думай, што я іх не маю.*

*Ты думай, што ўсё ў мяне добра,*
*Ёсць шчасцейка поўная торба*
*І сэрца – паўнютка натхнення...*
*Так вер і жыві без сумненняў.*

*Спакою твайго не парушу –*
*Душу ўсё сцярпець я прымушу.*
*І, можа, мне гэтак удасца*
*Цябе ўратаваць ад няшчасця.*